# Прывітанне дэлегатам XVIII камсамольскай канферэнцыі!

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ
І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 33 (542) Субота, 16 лістапада 1963 г. Цана 1 кап. Год выдання XVI-ы

## Актыўна наступаць!

ЗАЎТРА адбудзецца XVIII універсітэцкая камсамольская канферэнцыя. Як заўсёды, гэтая падзея выклікае вялікую цікавасць у ўсяго калектыву універсітэта. На гэты раз цікавасць да канферэнцыі асаблівая, бо яна павінна абмеркаваць дзейнасць універсітэцкай камсамольскай арганізацыі за перыяд, выключна багаты ідэйным зместам для ўсёй краіны. Рашэнні чэрвенскага Пленума ЦК КПСС, іншыя важнейшыя дакументы і мерапрыемствы партыі па камуністычнаму будаўніцтву садзейнічалі новаму рэзкаму ўздыму ўзроўню і ролі выхаваўчай работы, узмацнілі наступальны характар выхаваўчай работы, узмацнілі наступальны характар прапаганды і агітацыі як у горадзе, так і вёсцы.

Ажыццяўляючы гэтыя рашэнні, перабудоўваючы ўсю сваю работу ў святле новых патрабаванняў, камсамольскі атрад універсітэта пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі дасягнуў значных поспехаў. Наўрад ці хто стане аспрэчваць, напрыклад, вывад аб тым, што камсамольцы і іх важакі ўнеслі вялікі ўклад у павышэнне паспяховасці студэнтаў. З 2809 студэнтаў першых — чацвёртых курсаў мінулы навучальны год выдатна закончылі 263 чалавекі, а з выдатнымі і добрымі адзнакамі— яшчэ 890. Тут адыгралі сваю ролю і камсамольская патрабавальнасць, і ўзаемадапамога, якая была арганізавана камсамольцамі на некаторых курсах, і ўсе тыя мерапрыемствы, што ўзбагачалі веды студэнтаў, клікалі наперад.

Больш разнабаковай і дзейснай стала ідэалагічная работа. Традыцыйныя студэнцкія вечары дапоўніліся цікавымі цыкламі лекцый па тэорыі і гісторыі мастацтва, па іншых тэмах, якія цікавяць моладзь. Новым важным крокам да поспехаў у выхаваўчай рабоце з'явілася стварэнне дыскусійнага клуба Мінскага гарадскога таварыства «Веды» і камітэта камсамола БДУ «Ведаць, шукаць, змагацца!». Агеньчык камсамольскай ініцыятывы ў арганізацыі культурнага адпачынку студэнтаў усё ярчэй разгараецца ў інтэрнатах. Больш таго, клопаты і ўвагу камсамольскай арганізацыі студэнты адчувалі ў час канікул. Значна лепш, чым у мінулыя гады, правялі свой адпачынак фізікі і гісторыкі, філолагі і матэматыкі, біёлагі і хімікі, географы і юрысты.

Камітэт камсамола, факультэцкія камсамольскія бюро многае зрабілі па ўцягненню студэнтаў у грамадска карысную працу. Наша газета шмат аб гэтым пісала, і няма патрэбы паўтарацца. Падкрэслім толькі, што выхаванне ў кожнага студэнта любві і павагі да фізічнай працы, як гэтага патрабаваў чэрвенскі Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС, павінна быць у цэнтры ўвагі камсамольскай арганізацыі універсітэта не ў нейкія асобныя перыяды, а паўсядзённа.

Так, шмат перамог запісалі ў свой актыў камсамольцы універсітэта, і старшыя таварышы — камуністы ганарацца сваімі маладымі памочнікамі.

Ну, а недахопы, памылкі ў рабоце? На жаль, яны таксама ёсць. І нямала. Вось чаму на канферэнцыі павінна пайсці сур'ёзная размова ў першую чаргу аб тым, што не зроблена, не выканана, што трэба зрабіць, каб няўхільна рухацца наперад. Нават адзін той факт, што задачы камсамольскіх арганізацый вышэйшых навучальных устаноў увесь час узрастаюць і ўскладняюцца, паўстае супраць самазаспакоенасці. А нашай камсамольскай арганізацыі да таго ж неабходна выпраўляць памылкі мінулага, ліквідоўваць недахопы.

Возьмем такі прыклад. У летнюю экзаменацыйную сесію звыш 180 студэнтаў першых — чацвёртых курсаў атрымалі нездавальняючыя адзнакі. Ці ж не вінаватая ў гэтым камсамольская арганізацыя? Вядома ж, што больш за ўсё непаспяваючых на першых курсах, асабліва фізічнага, хімічнага, матэматычнага факультэтаў. Значыць, трэба накіраваць туды свае ўдарныя сілы, падабраць сапраўдны ключ, каб адчыніць шлях усім у клас паспяваючых. Больш ганаровай і важнай задачы ў камсамольцаў універсітэта, бадай, няма. Гутарка ідзе не проста аб адзнаках, а аб глыбокіх ведах, аб шырокім кругаглядзе ўсіх студэнтаў, іх моцнай ідэйнай загартоўцы.

І дамагацца гэтага можна і трэба не толькі агульнымі, масавымі мерапрыемствамі. Масавыя мерапрыемствы карысныя, іх трэба больш праводзіць. Але не менш важная задача — даходзіць да розуму і сэрца кожнага студэнта. Другімі словамі, трэба ўзняць ролю індывідуальнай работы, і вось тут дэлегатам канферэнцыі трэба сказаць сваё важкае слова.

Ёсць нямала іншых актуальных праблем камсамольскага жыцця, міма якіх не можа прайсці ўвага камсамольскай канферэнцыі. Гэта і пытанні павышэння ўзроўню навуковай студэнцкай работы, і пытанні ўнутрысаюзнай работы, пытанні стварэння яшчэ больш лепшых умоў для вучобы, пытанні барацьбы з парушальнікамі норм сацыялістычнай маралі і многія іншыя. Ці ж можна мірыцца з тым, што да гэтага часу ў нас дрэнна пастаўлена выхаванне на традыцыях нашага універсітэта? Нават многія старшакурснікі не ведаюць гісторыі сваёй вышэйшай навучальнай установы.

У цэлым, канферэнцыя павінна паслужыць павышэнню ролі камсамольскай арганізацыі БДУ ў выхаванні студэнцтва, у выхаванні высокаадукаваных, загартаваных змагароў за камунізм.

Поспехаў вам у рабоце, таварышы дэлегаты!

## Паведамленне

### аб скліканні Пленума Цэнтральнага Камітэта КПСС

ЦК КПСС ПРЫНЯЎ РАШЭННЕ СКЛІКАЦЬ ЧАРГОВЫ ПЛЕНУМ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КПСС 9 СНЕЖНЯ 1963 ГОДА.

НА АБМЕРКАВАННЕ ПЛЕНУМА ЦК УНОСІЦЦА ПЫТАННЕ: «АБ ДАЛЕЙШЫМ РАЗВІЦЦІ ХІМІЧНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ І ШЫРОКІМ ВЫКАРЫСТАННІ ХІМІЧНЫХ ПРАДУКТАЎ І МАТЭРЫЯЛАЎ У НАРОДНАЙ ГАСПАДАРЦЫ». ДАКЛАДЧЫКАМ ЗАЦВЕРДЖАН ПЕРШЫ САКРАТАР ЦК КПСС ТАВАРЫШ М. С. ХРУШЧОЎ.

У РАБОЦЕ ПЛЕНУМА ЦК ПРЫМУЦЬ УДЗЕЛ КІРУЮЧЫЯ ПАРТЫЙНЫЯ, САВЕЦКІЯ, ГАСПАДАРЧЫЯ, НАВУКОВЫЯ РАБОТНІКІ І НАВАТАРЫ ВЫТВОРЧАСЦІ З РЭСПУБЛІК, КРАЁЎ І АБЛАСЦЕЙ.

### Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР
### АБ СКЛІКАННІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР

Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР пастанаўляе:

Склікаць трэцюю сесію Вярхоўнага Савета СССР шостага склікання 16 снежня 1963 года ў гор. Маскве.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР
Л. БРЭЖНЕЎ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР
М. ГЕАРГАДЗЕ.

Масква, Крэмль.
12 лістапада 1963 г.

## ВЯЛІКІЯ ЗАДАЧЫ ПРАФСАЮЗНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

Напярэдадні свята 46-й гадавіны Вялікага Кастрычніка адбылася XXIII універсітэцкая прафсаюзная канферэнцыя. Дэлегаты студэнцкай прафсаюзнай арганізацыі абмяркоўвалі надзённыя задачы, што стаялі перад ёй у справаздачным перыядзе — з 25 лістапада 1962 года па кастрычнік гэтага года.

Работа XXIII універсітэцкай прафсаюзнай канферэнцыі праходзіла ў час работы XIII з'езда прафсаюзаў СССР. Гэты з'езд мае асабліва важнае значэнне. Ён не толькі падвёў вынікі дзейнасці прафсаюзаў, але і абмеркаваў далейшыя задачы прафсаюзнай арганізацыі краіны ў перыяд разгорнутага будаўніцтва камунізма.

У справаздачным перыядзе прафсаюзная арганізацыя Белдзяржуніверсітэта кіравалася рашэннямі партыйнага бюро, рэктарата, вышэй стаячых прафсаюзных органаў і рашэннямі XXII прафсаюзнай канферэнцыі.

(Заканчэнне на 2 стар.)

## Шчырыя пажаданні

Напярэдадні свята 46-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі асабліва цяжка было работнікам сувязі. Але паштальёны, тэлеграфісты не скардзіліся на гэта: заўсёды ж прыемна перадаваць словы цёплых пажаданняў поспехаў у рабоце, у вучобе, у асабістым жыцці. Ва ўсе куткі краіны неперапынным патокам ішлі словы гарачых прывітанняў.

У адрас нашага універсітэта таксама прыйшлі шматлікія віншаванні. Іх прыслалі:

Міністр вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесіянальнай адукацыі БССР М. В. Дарашэвіч,
Чэхаславацка-Савецкі інстытут Чэхаславацкай Акадэміі навук,
Саветнік пасольства ДРВ у СССР Тонг Хыу Зунг,
Другі сакратар пасольства ДРВ у СССР Дао Ван Ням,
Праўленне таварыства «Веды» Беларускай ССР.
Беларускі дзяржаўны інстытут праектавання,
Азербайджанскі дзяржаўны універсітэт імя С. М. Кірава,
Вільнюскі дзяржаўны універсітэт імя В. Капсукаса,
Горкаўскі дзяржаўны універсітэт імя Н. І. Лабачэўскага,
Далёкаўсходні дзяржаўны універсітэт,
Ераванскі дзяржаўны універсітэт,
Кабардзіна-Балкарскі дзяржаўны універсітэт,
Кіеўскі ордэна Леніна дзяржаўны універсітэт імя Т. Р. Шаўчэнкі,
Маскоўскі ордэна Леніна і ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўны універсітэт імя М. В. Ламаносава.
Пермскі дзяржаўны універсітэт імя А. М. Горкага,
Петразаводскі дзяржаўны універсітэт,
Таджыкскі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна,
Ташкенцкі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна,
Тбіліскі дзяржаўны універсітэт,
Чарнавіцкі дзяржаўны універсітэт,
Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту,
Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі,
Беларускі інстытут народнай гаспадаркі імя В. У. Куйбышава,
Беларускі інстытут фізічнай культуры,
Беларускі тэхналагічны інстытут імя С. М. Кірава,
Мінскі медыцынскі інстытут,
Мінскі педагагічны інстытут імя А. М. Горкага,
Магілёўскі педагагічны інстытут,
в'етнамскія студэнты, што навучаюцца ў БДУ імя У. І. Леніна,
выпускнікі Філіпік і Ужвіюк, што працуюць у Беластоку (Польшча),

Ад імя ўсяго калектыву універсітэта прыносім сардэчную ўдзячнасць калектывам, арганізацыям і асобным таварышам, якія прыслалі святочныя віншаванні ў адрас БДУ імя У. І. Леніна.

### НАСУСТРАЧ МІЖНАРОДНАМУ ДНЮ СТУДЭНТАЎ

*17 лістапада—Міжнародны дзень студэнтаў. Днямі адбылося пасяджэнне Клуба інтэрнацыянальнай дружбы, на якім абмяркоўвалася пытанне аб падрыхтоўцы да вечара, прысвечанага студэнцкаму святу, які адбудзецца заўтра ў біялагічным корпусе.*

* * *

*Бібліятэка БДУ арганізавала кніжна-ілюстратыўную выстаўку, прысвечаную Міжнароднаму дню студэнтаў. Матэрыялы выстаўкі расказваюць аб жыцці і вучобе студэнцтва за мяжой, параўноўваюць з палажэннем студэнтаў у Савецкім Саюзе.*

* * *

*В'етнамскія студэнты, што навучаюцца ў нашым універсітэце, арганізавалі фотавыстаўку, тэмай якой з'яўляюцца іх адпачынак у час летніх канікул, жыццё ў спартыўна-аздараўленчым лагеры, экскурсіі і паездкі па нашай краіне.*

## Універсітэт за тыдзень

### ДАДАТКОВЫ НАБОР У АСПІРАНТУРУ

*Белдзяржуніверсітэт аб'явіў дадатковы набор у аспірантуру па некаторых спецыяльнасцях з адрывам і без адрыву ад вытворчасці. Сярод спецыяльнасцей: тэарэтычная механіка, оптыка, неарганічная хімія, арганічная хімія, цыталогія, палітычная эканомія і іншыя. Уступныя экзамены адбудуцца ў снежні.*

### ІДЗЕ НАВАСЕЛЛЕ

*У студэнтаў універсітэта—вялікая і радасная падзея: яны атрымалі ў падарунак два карпусы новага інтэрната на 800 чалавек. Гэта значыць, што кожны пяты студэнт нашага універсітэта святкуе ў гэтыя дні наваселле. Светлыя прасторныя пакоі, добрае забеспячэнне бытавога і культурнага абслугоўвання—усё радуе наваёлаў.*

### ЛЕПШЫ ПАДАРУНАК—КНІГА

*Па ініцыятыве студэнтаў чацвёртага курса на гістарычным факультэце пачаўся збор кніг для школьнай бібліятэкі саўгаса «Стэпавы» Уральскай вобласці. Першы падарунак кніг студэнты ўручылі цаліннікам улетку, калі выязджалі для аказання дапамогі ў будаўніцтве.*

### ГУРТОК ЛАЦІНІСТАЎ

*На гістарычным факультэце ствараецца студэнцкі гурток па чытанню рымскіх аўтараў на лацінскай мове. Гурток арганізуе кафедра гісторыі старажытнага свету, кіраваць ім будзе адзін са старэйшых выкладчыкаў лацінскай мовы універсітэта С. І. Пільман.*

# Вялікія задачы прафсаюзнай арганізацыі

*(Пачатак на 1 стар.)*

У справаздачным дакладзе старшыні прафсаюзнага камітэта БДУ В. Макарэвіча і выступіўшых у спрэчках дэлегатаў дадзена шырокая карціна дзейнасці універсітэцкай прафсаюзнай арганізацыі за мінулы год.

У мінулым навучальным годзе рэктарат правёў значную работу па далейшаму ўдасканаленню вучэбных планаў і праграм, па ліквідаванню дубліравання матэрыяла і замене часткі лекцый практычнымі і лабараторнымі заняткамі, па паляпшэнню самастойнай работы студэнтаў. Гэтыя меры далі свае практычныя вынікі: летняя экзаменацыйная сесія прайшла больш арганізавана і на вышэйшым ідэйна-тэарэтычным узроўні, чым мінулая зімовая. Абсалютная большасць студэнтаў сур'ёзна, з усёй адказнасцю адносіцца да авалодання ведамі, большасць з іх трывала засвоіла праграмны матэрыял. Значна палепшыліся вынікі летняй сесіі, у параўнанні з зімовай, на гістарычным, юрыдычным і матэматычным факультэтах.

Аднак прафсаюзная арганізацыя не здолела ліквідаваць многія недахопы ў арганізацыі вучэбнага працэсу. Ужо той факт, што 6,4 працэнты студэнтаў першых — чацвёртых курсаў атрымалі нездавальняючыя адзнакі, сведчыць аб сур'ёзных прабелах у рабоце са студэнтамі. Па-ранейшаму нізкая паспяховасць на фізічным, матэматычным, хімічным факультэтах. Вялікі працэнт непаспяховасці падае на першыя курсы. Значыць, тут найбольш сур'ёзныя ўпушчэнні ў рабоце прафсаюзнай арганізацыі: своечасова не дапамагала адстаючым студэнтам, не арганізоўвала належны кантроль за іх самастойнай работай, слаба крытыкавала і асуджала абібокаў.

Прафсаюзная канферэнцыя прааналізавала стан культурна-масавай і палітыка-выхаваўчай работы ў БДУ. У гэтай рабоце арганізацыя кіравалася рашэннямі чэрвеньскага Пленума ЦК КПСС, якія вызначылі канкрэтныя меры па далейшаму ўдасканаленню ідэалагічнай работы.

Формы і метады палітыка-выхаваўчай работы прафсаюзнай арганізацыі універсітэта былі розныя: чытанне лекцый і дакладаў, правядзенне палітінфармацый і гутарак у акадэмічных групах і ў студэнцкіх інтэрнатах, экскурсіі на прадпрыемствы і ў калгасы, дыспуты па кнігах, сустрэчы з перадавікамі вытворчасці, з дзеячамі літаратуры і мастацтва. Гэтая работа знаходзіла шырокае асвятленне ў насценным друку і шматтыражнай газеце.

Сёлета значна палепшылі работу саветы ленінскіх пакояў у інтэрнатах №№ 1 і 4. Пры ленпакоях былі арганізаваны бібліятэчкі-перасоўкі, якія карысталіся папулярнасцю сярод студэнтаў. У ленпакоях заўсёды былі падшыўкі газет, часопісаў, меліся настольныя гульні.

На універсітэцкім і гарадскім аглядзе-конкурсе ленпакой інтэрната № 4 заваяваў першае месца.

Вялікую ўвагу прафсаюзная арганізацыя ўдзяляла пытанням быту і адпачынку студэнтаў. У інтэрнатах праведзена вялікая работа па навядзенню парадку і захоўванню тыпавых правіл. Рэгулярна праводзіліся праверкі санітарнага стану інтэрнатаў. Вынікі такіх праверак абмяркоўваліся на пасяджэннях студэнцкіх саветаў і жыллёва-бытавой камісіі. Самаабслугоўванне ў інтэрнатах за мінулы год значна палепшылася. Інтэрнат па вуліцы Дзімітрава на агульнагарадскіх і універсітэцкіх аглядах ужо чацвёрты год трымае першае месца. Калектыву інтэрната ўручан пераходны чырвоны сцяг.

Сёлета палепшыліся жыллёвыя ўмовы вялікай часткі студэнцтва нашага універсітэта: пабудаваны новы інтэрнат на 800 месц.

Дэлегаты XXIII агульнауніверсітэцкай прафсаюзнай канферэнцыі абмеркавалі работу і іншых камісій прафкома, адзначылі значныя дасягненні ў іх рабоце, ускрылі шэраг недахопаў, якія да гэтага часу яшчэ не ліквідаваны.

Канферэнцыя дала станоўчую ацэнку рабоце прафсаюзнага камітэта універсітэта. Яна абрала новы састаў прафкома на чале са студэнтам біялагічнага факультэта Уладзімірам Кеда і вызначыла задачы прафсаюзнай арганізацыі універсітэта на 1963—64 навучальны год.

Я. ЛЯХАЎ.

### Члены прафкома, выбраныя XXIII прафсаюзнай канферэнцыяй

КЕДА (біяфак)—старшыня прафкома,
МАКАРЭВІЧ (гістфак)—намеснік старшыні,
ВАРАБЕЙ (юрфак) — намеснік старшыні па арганізацыйнай рабоце,
ВЯЛЬ (фізфак) — намеснік старшыні па палітыка-выхаваўчай рабоце,
ЛАЗОЎСКАЯ (філфак) — сакратар,
РОЎБА (хімфак) — сакратар,
МЕЛЬНІКАЎ (геафак) — старшыня навукова-вучэбнай камісіі,
САКАЛОЎСКАЯ (матфак),
ДРАБ (фізфак) — члены навукова-вучэбнай камісіі,
АРЦЮКЕВІЧ (матфак) — старшыня культурна-масавай камісіі,
МАКРЫЦКІ (фізфак) — член культурна-масавай камісіі,
ЧЭРАЗАВА (матфак) — старшыня жыллёва-бытавой камісіі.
ПЯРКОЎСКАЯ (хімфак),
СМОЛЯК (гістфак),
ІВУЦЬ (матфак),
БЯРЭЙШЫН (фізфак) — члены жыллёва-бытавой камісіі,
РУСАК (юрфак) — старшыня аздараўленчай камісіі,
СТАВЕЦКАЯ (хімфак) — член аздараўленчай камісіі,
ПРУЖАНОЎСКІ (юрфак)—старшыня абаронна-спартыўнай камісіі,
КРАЎЧАНКА (гістфак) — старшыня камісіі грамадскага кантролю,
ТРАФІМЧУК (філфак) — член камісіі грамадскага кантролю,
ВІЦЬКО (геафак) — старшыня шэфскай камісіі.

# „Я—СЫН ТВОЙ, НЕБА!"

*Такую назву будзе мець першы зборнік вершаў маладога універсітэцкага паэта Эдуарда Зубрыцкага. Зборнік выйдзе ў свет у будучым годзе ў Белдзяржвыдавецтве.*

*Эдуарду Зубрыцкаму — 21 год. Ён займаецца на 3 курсе аддзялення беларускай мовы і літаратуры нашага універсітэта. Друкавацца пачаў у 1960 годзе. Ніжэй мы змяшчаем некалькі вершаў Э. Зубрыцкага з падрыхтаванага ім зборніка.*

*Жадаем Эдуарду вялікіх творчых поспехаў!*



Эдуард ЗУБРЫЦКІ

## Планета Маленства

Тут кожны камень — радасць.
Сцежка кожная — ўспамін
Аб днях маленства блізкіх і такіх далёкіх,
Як шлях да Венеры.
Да Венеры ж можна дабрацца.
Блукаць на яе лугах дасхочу
І зрываць венеранскія кветкі ў вянок жонцы.
(З умовай, калі ёсць там якое жыццё).
Для гэтага трэба надзейны зорны экспрэс
«Зямля—Венера».
Да планеты Маленства дабрацца цяжка,
Амаль немагчыма,
І то на нейкі нязначны час
Экспрэсам, што называецца сном.
Хораша тады на лугах планеты Маленства!
Дзе кожны звычайны зялёны конік — каваль
Тваіх радасцей і спадзяванняў,
Спраўджаных і няспраўджаных дзіцячых мар,
Дзе ветры і сонца над табою
Прапахлі цёплым каровіным малаком.
А потым... потым настае раніца...
Планета Маленства ўсё аддаляецца і аддаляецца,
І нарэшце знікае на самых далёкіх недасягальных
Арбітах.
І толькі часам на арбіту неабсяжнай, як акіян,
Чалавечай памяці
Усплываюць маленькія, ды важкія метэарыты —
Успаміны...

## Гарыць мая восень...

За акном, адшліфаваным ветрам,
Падаюць ціха, без грому, дажджы.
І вішань азяблых ружовае веццє
Струною настылай дрыжыць.
Няласкае неба з надхмар'я,
Бы ў злосці якой да зямлі,
Кідае на ўсмешкі, на сонца,
на мары
Адвечнага смутку «курлы».
Дажджы і дажджы...
Замірае жывое
І ніцма лажыцца на травы
лістом.
Адно толькі полымя восені злое
Узгараецца недзе за дальнім
кустом.
Яно ўсё бліжэй і бліжэй
падступае.
І вось ужо неба апёкшы сутонь,
Усміхнуўшыся ярка, уміг
прыпадае
У пацалунку да шыбаў акон.
Акяніцы закрыю:
агонь не пранікне,
І сум жураўліны не пройдзе
сюды.
Гарыць мая восень.
Гараць мае нівы.
Гараць успаміны. Палаюць сады.

## Не спіцца ўдаве

*Пажаўцелы ад часу здымак
На скрыпучым трохногім стале...
Колькі часу не спіцца жанчыне,
Колькі часу не спіцца ўдаве!
За акном шалясціць бліскавіца,
За акном штохвіліны цямней.
Ды не спіцца адной жанчыне.
Ды не спіцца адной удаве.
Усё чакае, а можа ён прыдзе,
Прыхіне, як калісь, да грудзей?..
І не спіцца ніяк жанчыне,
І не спіцца ніяк удаве.
Спіць дачушка з усмешкай
на вуснах.—
Хто ж спакойныя сны зберажэ?!
І не спіцца таму жанчыне,
І не спіцца таму ўдаве.
Сорак пяць ёй сягоння стукнула.
Сорак пяць у яе акне...
І не спіцца ніяк жанчыне,
І не спіцца ніяк удаве.
І ішлі да яе мужчыны.
«Слухай... Мар'я... як ты
жывеш?!»
І ўздыхнецца тады жанчыне,
Уздыхнецца тады ўдаве...
І не зможа даць згоды «хлопцам»,
Хоць яно удваіх лягчэй:
Пажаўцелы ад часу здымак
На скрыпучым трохногім стале...*

## Чорнае мора

Людзі,
Не будзіце яго, калі ласка.
Бачыце?
Мора спіць,
Ухапіўшыся моцна рукамі
За прыбярэжныя цёплыя камні.
Не будзіце яго, прашу вас...
Мора спіць.
Усміхаецца некаму
Добрай усмешкаю
І люляе на хвалях
Спакойных блакітных медуз.
Ды парою ўздыхне:
За дзень натамілася,
На спіне перавозячы
Цяжкія грузы...
Не будзіце яго, калі ласка...
Бачыце?
Мора спіць,
Ухапіўшыся моцна рукамі
За прыбярэжныя цёплыя камні.
Няхай яно бачыць
Свае добрыя сінія сны.

# З перамогай, Галіна!

Зала пасяджэнняў вучоных саветаў. Ідзе чарговая абарона кандыдацкай дысертацыі. За кафедрай — невысокая жанчына з добрымі разумнымі вачамі, супрацоўніца лабараторыі фотасінтэзу Галіна Адамаўна Ліпская. Яна дакладвае аб выніках чатырохгадовага даследавання.



Пытанні—адно, другое, трэцяе... Колькі іх будзе? Пытаюцца фізіёлагі, глебазнаўцы, генетыкі. Галіна Адамаўна адказвае ўпэўнена і пераканаўча.

Хораша, цёпла гаворыць пра дысертантку і яе працу навуковы кіраўнік акадэмік Ціхан Мікалаевіч Годнеў.

А цяпер самае галоўнае. Выступаюць афіцыйныя апаненты прафесар М. Я. Школьнік і прафесар В. М. Цярэнцьеў. І зноў усё добра. Іх думка аднадушная. Выканана праца на належным навуковым узроўні, вынікі яе — яшчэ адзін важны крок у пазнанні фізіялагічнай ролі мікраэлементаў у жывым раслінным арганізме. Прафесар М. Я. Школьнік, адзін з вядомых савецкіх «мікраэлементшчыкаў», падкрэслівае, што ўстаноўленыя дысертанткай заканамернасці, якія датычацца да накаплення зялёных пігментаў і каратыноідаў у хларапластах раслін пад уплывам бору, марганцу, медзі, цынку, кобальту, нікелю і малібдэну, не апісаныя яшчэ ў навуковай літаратуры, маюць значную тэарэтычную каштоўнасць і вялікае значэнне для практыкі раслінаводства.

І не дзіўна, што яшчэ да пачатку галасавання старэйшы член Вучонага савета прафесар В. I Жылкін сардэчна павіншаваў Галіну Адамаўну з паспяховай абаронай дысертацыі. Праз некалькі хвілін сталі вядомы і вынікі тайнага галасавання — члены Вучонага савета аднадушна ўхвалілі працу маладога вучонага.

Інакш і быць не магло. Ужо колькі гадоў мы ведаем Галіну Адамаўну, бачылі, як упарта яна працавала над дысертацыяй, як строга і самакрытычна адносілася да вынікаў сваіх эксперыментаў.

Віншуючы Галіну Адамаўну Ліпскую з вялікім поспехам у навуковай працы, нам хочацца сказаць і пра другое, пра яе самую, чулую, сардэчную, заўсёды справядлівую і прынцыповую ў адносінах да людзей. У аспірантуры Галіна Адамаўна займалася не толькі навуковай працай. Свой вольны час яна прысвячала літаратуры, музыцы, мастацтву.

Мы жадаем Галіне Адамаўне Ліпскай аднаго: ніколі і ні ў чым не зніжаць тэмпаў, заўсёды ісці толькі ўперад.

Н. ПАРАХНЕВІЧ,
Л. ХАДАРЭНКА,
А. АНЦІПАВА,
супрацоўнікі лабараторыі фотасінтэзу.

# Добрая традыцыя

У работнікаў кафедры і кабінета палітычнай эканоміі становіцца добрай традыцыяй сустракацца са студэнтамі на вечарах пытанняў і адказаў па эканамічныя тэмы. Першая і другая такія сустрэчы адбыліся ў студэнцкім інтэрнаце па вул. Дзімітрава. На апошнюю сустрэчу са студэнтамі хімічнага, юрыдычнага і геаграфічнага факультэтаў прыйшлі дацэнты А. П. Скуман, І. К. Караленка і У. В. Цакуноў.

Дзякуючы папярэдняй падрыхтоўцы вечара, размова студэнтаў і выкладчыкаў была цікавая. Студэнты задалі некалькі дзесяткаў пісьмовых і вусных пытанняў і, зразумела, атрымалі ад вучоных глыбокія і змястоўныя адказы.

Н. А. ЯРАВІКОЎ,
загадчык кабінета палітычнай эканоміі.

Рэдактар М. ІОСЬКА.

Адрас рэдакцыі:
Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 05313. Тыр. 2000. Зак. 4223